# ИСТОРИЧЕСКИЕ НАУКИ

*В. М. Бароўская*
Інстытут гісторыі, Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Мінск

*V. Borovskaya*
Institute of History, National Academy of Sciences of Belarus, Minsk

**УДК 94 (476:4-470)”1923/1924”**

## АСАБЛІВАСЦІ ЗАКЛЮЧЭННЯ САВЕЦКА-ПОЛЬСКАЙ КОНСУЛЬСКАЙ КАНВЕНЦЫІ ДЛЯ САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ Ў 1923–1924 ГГ.

## FEATURES OF THE CONCLUSION OF THE SOVIET-POLISH CONSULAR CONVENTION FOR SOVIET BELARUS IN 1923–1924

*У артыкуле за кошт прыцягнення шырокага кола архіўных крыніц, якія ўпершыню ўводзяцца ў навуковы зварот, выкарыстанне спецыяльна-гістарычных метадаў, прынцыпаў гістарызму і аб’ектыўнасці робіцца выснова, што праблема натыфікацыі Польшчай працэса стварэння СССР у 1923 г. і заключэння савецка-польскай консульскай канвенцыі 1924 г. адбывалася ў надзвычай складаных умовах. Гэта тлумачыцца жаданнем польскага кіраўніцтва ў атрыманні дадатковых ільгот, у выглядзе пашырэння свайго дыпламатычнага прадстаўніцтва, за кошт юрыдычнага прызнання новай дзяржавы.*

*Ключавыя словы: Рыжскі дагавор; БССР; Польшча; консульская канвенцыя; стварэнне СССР.*

*In the article due to the involvement of a wide range of archival sources, which are introduced into scientific circulation for the first time, the use of special historical methods, the principles of historicism and objectivity, the conclusion is made that the problem of Poland’s notification of the process of creation of the USSR in 1923 and conclusions of the Soviet-Polish consular convention of 1924 took place in extremely difficult conditions. This is explained by the desire of the Polish leadership to receive additional benefits, in the form of expanding its diplomatic representation, at the expense of legal recognition of the new state.*

*Keywords: Riga Treaty; BSSR; Poland; consular convention; creation of the USSR.*

Падпісанне Рыжскага мірнага дагавора паміж савецкімі рэспублікамі і Польшчай у сакавіку 1921 г. заклала пачатак новага этапу ў развіцці двухбаковых савецка-польскіх адносін. Пытанне заключэння савецка-польскай канвенцыі ў 1924 г. знайшло сваё асвятленне на старонках даследаванняў савецка-польскіх адносін міжваеннага перыяду. У айчыннай гістарыяграфіі неабходна адзначыць працы М. М. Мезгі [1], В. М. Цынкевіча [2], У. Е. Снапкоўскага [3], у польскай – У. Скуры [4], М. Корната и В. Матэрскага [5], расійскай – А. В. Бабенка [6]. Аднак, на жаль, у згаданых напрацоўках не было разгледжана пытанне часу з’яўлення дыпламатычнага

прадстаўніцтва Польшчы ў Мінску, якое знаходзілася ў цеснай узаемасувязі з працэсам заключэння савецка-польскай консульскай канвенцыі. Даследаванне вопыту ўзаемаадносін паміж дзяржавамі з рознымі грамадска-палітычнымі і культурна-канфесійнымі сістэмамі, паміж уладай і этнічнымі групамі, на розных этапах гісторыі Беларусі, у тым ліку і ў міжваенны адрэзак часу, мае значны практычны вынік. Асноўнымі крыніцамі па праблеме сталі матэрыялы Архіва знешняй палітыкі Расійскай Федэрацыі, Архіва актаў новых у Варшаве. Большасць архіўных матэрыялаў упершыню ўводзіцца ў навуковы зварот.

Падпісанне савецка-польскіх канвенцый было прадугледжана ўмовамі Рыжскага мірнага дагавора. Аднак абодва бакі не ставілі гэта пытанне ў разрад першачарговых, імкнучыся адцягваць іх падрыхтоўку на як мага позні час, ставячы ў залежнасць ад агульнага працэсу выканання рыжскіх дамоўленасцей (у першую чаргу матэрыяльных абавязкаў). У выніку справа заключэння двухбаковых канвенцый была адсунута на сярэдзіну-канец 1923 г. і стала адной з умоваў юрыдычнага прызнання польскім бокам новага дзяржаўнага федэратыўнага ўтварэння – СССР. Калі заключэнне санітарнай (7 лютага 1923 г.), паштова-тэлеграфнай канвенцый (24 мая 1923 г.) тлумачылася практычнай неабходнасцю, то консульская канвенцыя стала сапраўдным двухбаковым кампрамісам.

20 лютага 1923 г. у лісце Р. Кноля, паўнамоцнага прадстаўніка Польшчы ў РСФСР, да С. Залеўскага, рэферэнта Усходняга аддзела Міністэрства замежных спраў (МЗС) Польшчы, адзначалася, што падчас сустрэчы ў Народным камісарыяце замежных спраў (НКЗС) РСФСР была ўзнята праблема заключэння консульскай канвенцыі паміж бакамі аб спрыяльнасці моманту для лагоднага яе вырашэння [7, s. 306–308]. 10 чэрвеня 1923 г. у мемарандуме Усходняга аддзела МЗС Польшчы, паданага міністру замежных спраў Польшчы па пытаннях, звязаных з выкананнем Рыжскага мірнага дагавора, выказваецца жаданне пераўтварэння органаў, адказных за рэпатрыяцыю і аптацыю, у консульскія. У мемарандуме адзначалася, што “без валодання ў Мінску памяшкання, якое б карысталася сапраўднай недатыкальнасцю, немагчыма там ажыцяўленне ніякай інфармацыйнай, палітычнай ці вайсковай дзейнасці, працы, якая ў нармальных умовах можа мець вельмі важнае значэнне” [7, s. 347–348]. Усходні аддзел МЗС Польшчы ўносіў прапанову аб акрэдытаванні пасла ў Маскве і пры беларускім урадзе і стварэнні пасольства Польшчы ў Мінску, у якім з-за адсутнічаючага пасла (які адначасова з’яўляецца паслом у Маскве і Тыфлісе), быў бы заменены ў рангу паверанага ў справах (chargé d’affaires), дыпламатычным супрацоўнікам у рангу легацыйнага сакратара. Пры гэтым пасольстве можна было б, пасля акрэдытавання, утварыць консульскі аддзел, які (незалежна ад канвенцыі) мог бы пераняць аптацыйныя справы, а ў будучым і спадчыну рэпатрыяцыі. Плануемая змена

ў Мінску магла выклікаць дадатковыя крэдыты ў суме 500–600 долараў штомесяц, без уліку аднаразовага ўстановачнага крэдыту.

3 ліпеня 1923 г. Р. Кноль звяртаўся да міністра замежных спраў Польшчы з выказваннем намеру аб накіраванні ў Маскву дырэктара Усходняга аддзела МЗС Польшчы Ю. Бабінскага і яго намесніка Ю. Збышэўскага з мэтай сустрэчы 21 чэрвеня 1923 г. з прадстаўнікамі НКЗС СССР па пытанні абмеркавання ўмоваў заключэння консульскай канвенцыі [7, s. 366–367]. Савецкае кіраўніцтва выказала лагодна адносна гэтай польскай прапановы. Новы паўнамоцны прадстаўнік СССР у Польшчы Л. Л. Абаленскі валодаў паўнамоцтвамі па заключэнні гэтай дамовы. Аднак МЗС Польшчы ў першую чаргу хацеў выкарыстаць факт падрыхтоўкі консульскай канвенцыі як умову поўнага выканання ўмоў Рыжскага мірнага дагавора (у першую чаргу арт. 13, актывізацыя працы змешанай разліковай камісіі, выдача неабходных архіўных дакументаў для гэтай справы). У выніку Савет Міністраў Польшчы ўпаўнаважыў 15 сакавіка 1923 г. міністра замежных спраў на заключэнне консульскай канвенцыі з «Расіяй і Украінай». 21 ліпеня 1923 г. павінны былі адбыцца перагаворы па гэтым пытанні: ад савецкага боку – І. Л. Лорэнц (старшыня), І. А. Пергамент, член разліковай камісіі; ад польскага боку – Ю. Бабінскі (старшыня), Ю. Пазнаньскі, Я. Яблоньскі [7, s. 373–375]. Пытанне ўтварэння ў Мінску філіяла пасольства Польшчы ў Маскве было вырашана адмоўна.

17 ліпеня 1923 г. у тэлеграме паўнамоцнага прадстаўніка Польшчы ў Маскве Р. Кноля міністру замежных спраў Польшчы паведамлялася аб накіраванні ноты 16 ліпеня 1923 г. ад прадстаўніка БССР у РСФСР (СССР) М. І. Мароза аб уступленні БССР у СССР. Так, 25 ліпеня 1923 г. у нататцы міністра замежных спраў Польшчы адносна пытання стварэння СССР указвалася, што ў польскага кіраўніцтва ўзнікаюць апасенні, што новапаўсталая дзяржава можа адмовіцца ад выканання міжнародных дагавораў, падпісаных толькі “часткай саюзнай дзяржавы”, “новая канстытуцыя ў сваёй аснове абмяжоўвае незалежнасць Украіны і Беларусі, якая была гарантавана II арт. Рыжскага дагавора як Польшчай, так і РСФСР. Аднак польскі ўрад не можа не прызнаць СССР, бо гэта б азначала адмовіцца ад выканання Рыжскага мірнага дагавора і разарванне дыпламатычных адносін [7, s. 382–383]. У разважаннях Р. Кноля, накіраваных да міністра замежных спраў Польшчы 6 жніўня 1923 г., указвалася на магчымасць прызнання дэ-юрэ СССР, з захаваннем некаторых умоваў адносна незалежнасці УССР і БССР, разам з утварэннем у Маскве прадстаўніцтва ў рангу пасольства. Прадугледжвалася безумоўнае выкананне Рыжскага дагавора, утварэнне консульстваў у Харкаве, Мінску, Тыфлісе [7, s. 387–388]. У канцы ліпеня – пачатку жніўня адбыўся шэраг сустрэч Л. Л. Абаленскага, паўнамоцнага прадстаўніка РСФСР (СССР) у Польшчы з намеснікам міністра замежных спраў Польшчы Г. Страсбургерам па пытанні юрыдычнага прызнання СССР. Аналагічным парадкам адбываліся сустрэчы Р. Кноля з Г. В. Чычэрыным.

19 жніўня 1923 г. адбылася другая сустрэча Г. Страсбургера з Л. Л. Абаленскім. Пытанне натыфікацыі стварэння СССР з боку Польшчы выклікала затрымкі ў працы змешаных камісій, патрабавала распаўсюджвання ўмоў дагавора на ўсё складаючыя часткі СССР, у тым ліку на тыя, з якімі не былі ўсталяваны дыпламатычныя адносіны [7, s. 395–396]. 31 жніўня 1923 г. польскі ўрад зацвердзіў прызнанне СССР пры прыняцці наступных умоваў: 1) Рыжскі мірны дагавор, усе дамовы і канвенцыі, заключаныя паміж польскім урадам і ўрадамі РСФСР, УССР, БССР захоўваюць сваю юрыдычную моц і будуць ва ўсёй сваёй шырыні выкананы ўрадам Саюза; 2) польскі ўрад утварае ў Харкаве, Тыфлісе і Мінску, пры ўпаўнаважаных НКЗС СССР аддзяленні пасольства Польшчы ў Маскве [7, s. 403–404].

13 верасня 1923 г. Польшча атрымала ў адказ ноту ўрада СССР, у якой нота з польскімі прапановамі расцэньвалася як спроба перагляду Рыжскага дагавора, што магло выклікаць адпаведныя крокі па яго пераглядзе і з боку СССР. Пазіцыя Польшчы ў справе прызнання СССР змянілася са зменай міністра замежных спраў. 13 снежня польскі ўрад прыняў да ведама натыфікацыю аб стварэнні СССР. У ноце ў адказ СССР «у мэтах далейшага афармлення сяброўскіх адносін» прадставіў польскаму ўраду, незалежна ад падлягаючай заключэнню консульскай канвенцыі, права неадкладнага адкрыцця генеральных консульстваў у Харкаве і Мінску і пагадзіўся на працяг тэрмінаў аптацыі польскага грамадзянства [7, s. 408].

2 кастрычніка 1923 г. міністр замежных спраў Польшчы М. Сейда накіраваў тэлеграму да Р. Кноля з інструкцыямі да далейшых перагавораў з прадстаўнікамі НКЗС СССР. У ёй былі ўнесены значныя змены ў пункт адносна ўтварэння аддзяленняў пасольства Польшчы ў Харкаве, Мінску, Тыфлісе. У выніку польскі бок пагадзіўся на адкрыццё ў гэтых гарадах Генеральных консульстваў, пры ўмове заключэння консульскай канвенцыі. Консульства былі як філіі пасольства Польшчы, польскі пасол мог накіраваць любога супрацоўніка для замяшчэння асноўнага супрацоўніка, прадугледжвалася гарантаванне права дыпламатычнай недатыкальнасці, будынка, супрацоўнікаў, выкарыстанне шыфру, абарона дыпламатычных кур’ераў [7, s. 414].

Пытанне адкрыцця консульскіх аддзелаў у Харкаве, Мінску, Тыфлісе сутыкалася з праблемай пошуку адпаведных памяшканняў. Перагаворы аб падпісанні консульскай канвенцыі пачаліся ў Маскве 21 сакавіка 1924 г. Польскі бок быў прадстаўлены Л. Дароўскім і начальнікам аддзелу ў Консульскім дэпартаменце МЗС Польшчы К. Пазнаньскім. З савецкага боку – член Калегіі НКЗС В. Л. Коп, начальнік аддзела балтыйскіх краін і Польшчы НКЗС Б. Я. Штэйн. Таксама былі далучаны эксперты і іншыя спецыялісты.

Перагаворы па заключэнні консульскай канвенцыі пачаліся ў Маскве 21 сакавіка 1924 г. Пацяпленне ў савецка-польскіх адносінах, якое пачалося

пасля фарміравання ў снежні 1923 г. ураду У. Грабскага, а таксама прызначэння новага пасла Л. Дароўскага ў Маскву, садзейнічала паспяховым перагаворам. Канвенцыя была падпісана 18 ліпеня 1924 г. Прадугледжвалася, акрамя існуючых прадстаўніцтваў у Харкаве і Мінску, стварэнне консульстваў у Ленінградзе, Кіеве, Хабараўску і Тыфлісе. Для супрацоўнікаў консульстваў ствараўся новы тып імунітэту. Канвенцыя набыла моц у красавіку 1926 г. Пры гэтым пры яе разглядзе ў польскім сейме частка дэпутатаў Беларускага пасольскага клуба выступіла супраць ратыфікацыі, разглядаючы яе як вынік Рыжскага міру. У гэтым жа годзе консульства ў Мінску было пераўтворана ў Генеральнае консульства (хоць беларускія ўлады называлі яго генеральным з самага пачатку). 25 сакавіка 1924 г. Я. Карчэўскі быў зацверджаны НКЗС СССР Генеральным консулам Польскай Рэспублікі ў г. Мінску з консульскай акругай на ўсю тэрыторыю БССР. 26 красавіка 1924 г. упаўнаважаны НКЗС пры ўрадзе БССР М. Ітві разаслаў паведамленне аб гэтым народным камісарыятам БССР з тлумачэннем, што Я. Карчэўскі мае права зносіцца праз упраўленне ўпаўнаважанага НКЗС СССР з савецкімі ўстановамі па справах генконсульства; перапіска генконсульства, канцылярыя і архіў з'яўляюцца недатыкальнымі; генеральны консул мае ўсе правы ў адпаведнасці з дыпкарткай НКЗС.

У 1924 г. у Мінску было адкрыта польскае консульства. Да стварэння консульства яго функцыі часткова выконвала аддзяленне Змешанай камісіі па рэпатрыяцыі. Нягледзячы на адсутнасць суседскага ўзаемадаверу, БССР і Польшча ўсё ж былі вымушаны стварыць практычныя механізмы выканання дагаворных палажэнняў па мірным уладкаванні, арганізаваць рэпатрыяцыю шматлікіх ахвяр ваенных дзеянняў, развіваць дагаворна-прававую базу для вырашэння непазбежных памежных і міждзяржаўных праблем. Дзякуючы свайму геаграфічнаму становішчу і статусу ўдзельніка Рыжскага мірнага дагавора, БССР з'яўлялася выканаўцам (хоць і фармальным) шэрагу савецка-польскіх канвенцый, якія датычылі забеспячэння консульскіх паслуг, міжнародных, медыка-санітарных, мерапрыемстваў, перамяшчэння асоб, грузаў, паштова-тэлеграфнай карэспандэнцыі.

Пытанне аб арганізацыі польскага прадстаўніцтва ў БССР было канчаткова вырашана толькі пасля стварэння СССР. 13 мая 1923 г. на нарадзе прадстаўнікоў саюзных рэспублік у НКЗС РСФСР аб стварэнні СССР адзначалася, што ў сувязі са стварэннем СССР дзейнасць замежных місій у рэспубліках спыніцца да атрымання консуламі новых экзекватур ужо ад НКЗС СССР. Пасля зацвярджэння 6 ліпеня 1923 г. сесіяй ЦВК СССР Дэкларацыі і Дагавора аб стварэнні СССР у паўнамоцнае прадстаўніцтва БССР у Маскве быў накіраваны тэкст натыфікацыі аб уваходжанні БССР у склад СССР з даручэннем перадаць яго паўнамоцным прадстаўнікам Польшчы і Германіі, з якімі Беларусь знаходзіцца ў адносінах дэ-юрэ, а таксама Эстоніі, Літве, Латвіі, з якімі Беларусь ўсталявала адносіны дэ-факта.

Адпаведная нота была перададзена 16 ліпеня паверанаму ў справах Польшчы ў РСФСР Р. Кнолю. 21 ліпеня НКЗС БССР перадаў аналагічную ноту ў прадстаўніцтва польскай дэлегацыі ў Змешанай камісіі па рэпатрыяцыі. 12 верасня Старшыня ЦВК і СНК, народны камісар замежных спраў А. Р. Чарвякоў распаўсюдзіў заяву аб перадачы ўраду СССР паўнамоцтваў БССР на вядзенне ўсіх міжнародных спраў. З 15 верасня 1923 г. Паўнамоцнае прадстаўніцтва БССР пры ўрадзе СССР спыніла консульскую працу і перадало незавершаныя справы з НКЗС СССР.

Консульства Польшчы ў Мінску інфармавала свае ўлады аб палітыцы БССР, становішчы масцовых палякаў, аказвала праз Расійскае таварыства Чырвонага Крыжа і напрамую дапамогу арыштаваным і дабрачынную дапамогу мясцовым палякам. У снежні 1928 г. упаўнаважаны НКЗС СССР пры ўрадзе БССР А. Ф. Ульянаў у лісце калегіі НКЗС СССР Б. Стаманякаву адзначаў спробы ўзмацнення кантактаў польскага генеральнага консула ў БССР Т. Янкоўскага з інтэлігенцыяй Беларусі (просьбы консула дазволіць азнаёміцца з дзейнасцю БАН, Дзяржаўнага музея, бібіліятэкі) і лічыў неабходным ізаляваць консульства ад такіх кантактаў, абмежаваўшы іх афіцыйнымі. Консульства ў Мінску працавала да канца 1930-х гг. У другой палове 1920-х гг. консулам быў Т. Янкоўскі, з 1930 г. яго змяніў Я. Гайдзінскі.

Па Палажэнні аб дыпламатычных і консульскіх прадстаўніцтвах замежных дзяржаў на тэрыторыі СССР1925 г. консулы прызначаліся па ўзгадненні з урадам БССР. У жніўні 1937 г. былі зачынены генеральныя консульствы ў Тбілісі і Харкаве, у СССР прадстаўніцтвы Польшчы захоўваліся ў Мінску і Кіеве, консульства ў Ленінградзе і пасольства і генеральнае консульства ў Маскве.

У жніўні 1926 г. пастановай ЦВК і СНК СССР быў зацверджаны жорсткі парадак зносін саюзных рэспублік з урадавымі ўстановамі і службовымі асобамі замежных дзяржаў. Усе зносіны, акрамя культурнага і бытавога характару, адбываліся праз упаўнаважанага НКЗС СССР у БССР. Пісьмовыя звароты замежнага прадстаўніцтва па пытаннях палітычнага і дзяржаўнаэканамічнага значэння неабходна было тэрмінова пераслаць на адрас НКЗС СССР разам з матэрыяламі па пытанні. За парушэнні прадугледжвалася крымінальная і дысцыплінарная адказнасць.

Такім чынам, пытанне заключэння савецка-польскай консульскай канвенцыі, падпісанне якой прадугледжвалася ўмовамі Рыжскага мірнага дагавора, знаходзілася ў цеснай узаемасувязі з агульным станам двухбаковых адносін. Таму пад уплывам крызісных момантаў узаемаадносін паміж Польшчай і СССР падрыхтоўка канвенцый адкладвалася на нявызначаны тэрмін. Хоць праблематыка, якую павінны былі рэгламентаваць гэтыя міжнародна-прававыя акты, была вельмі надзённай, без іх вырашэння адбывалася замаруджванне многіх міграцыйных, гандлёвых і лагістычных працэсаў.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Мезга, Н. Н.* Советско-польские отношения 1921–1926 годов: новый этап противостояния; Гомельский гос. ун-т им. Ф. Скорины / Н. Н. Мезга. – Гомель: ГГУ им. Ф. Скорины, 2019. – 229 с.

2. *Цынкевіч, В.* Праблема рэпатрыяцыі бежанцаў і адкрыццё польскага консульства ў Мінску (1921–1924 гг.) / В. Цынкевіч // Белорусский журнал международного права и международных отношений. – 2001. – № 3. – С. 76–83.

3. *Снапкоўскі, У. Е.* Беларуска-польскія адносіны (1918–1989 гг.): Даследаванні, дакументы, ілюстрацыі і карты / У. Е. Снапкоўскі. – Мінск: «Энцыклапедыкс», 2013. – 334 с.

4. *Skóra, W.* Służba konsularna Drigiej Rzeczypospolitej. Organizacja, kadry i działalność / W. Skóra. – Warszawa, 2006. – 410 s.

5. *Kornat, M.* Między pokojem a wojną. Szkice o dyplomacji polskiej lat 1918–1945 / M. Kornat, W. Materski. – Warszawa, 2015. – 164 s.

6. *Бабенко, О. В.* Польско-советские отношения в 1924–1928 гг.: от противостояния к сотрудничеству / О. В. Бабенко. – Москва, 2007. – 224 с.

7. Dokumenty do historii stosunków polsko-sowieckich 1918–1945 / red. serii M. Wołos. – T. I: 1918–1926. – Cz. 2: Poszukiwanie normalizacji (kwiecień 1921 – maj 1926). – Warszawa, 2020. – 950 s.

**(Дата падачы: 05.02.2024)**

*В. А. Белозорович*
Гродненский государственный университет имени Янки Купалы

*V. Belazarovich*
Yanka Kupala State University of Grodno

**УДК 930(476)”19”**

# ГЕНЕРАЦИЯ ПОКОЛЕНИЙ УЧЕНЫХ-ИСТОРИКОВ БЕЛОРУССКОЙ ССР

# GENERATION OF GENERATIONS OF SCIENTISTS-HISTORIANS OF THE BYELORUSSIAN SSR

*В статье раскрыты вопросы формирования трех поколений белорусских историков: «старая школа», первое марксистское поколение, послевоенное поколение, проанализирован их вклад в развитие концепции истории Беларуси. Показано, что в исторической науке Белорусской ССР сложилась преемственность поколений исследователей. Утверждается, что концептуальное видение истории Беларуси определялось общими методологическими подходами, господствовавшими в советской исторической науке.*